# Літаратуразнаўства

У. А. НАВУМОВІЧ

## ПАФАСАМ СУМЛЕННЯ

Фарміраванне новага чалавека — адна з трыадзінай задачы пабудовы камунізма — ляжыць у аснове стваральнай дзейнасці мас, Камуністычнай партыі, з'яўляецца галоўным вызначальным фактарам у ацэнцы дасягнутага мастацкай літаратурай на сучасным этапе.

«Маральнае здароўе грамадства, духоўны клімат, у якім жывуць людзі, у немалой ступені вызначаюцца станам **літаратуры і мастацтва**... — падкрэсліў у Палітычным дакладзе ЦК КПСС XXVII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза таварыш М. С. Гарбачоў. — Наша літаратура, адлюстроўваючы нараджэнне новага свету, разам з тым актыўна ўдзельнічала ў яго станаўленні, фарміруючы чалавека гэтага свету — патрыёта сваёй Радзімы, сапраўднага інтэрнацыяналіста. Тым самым яна правільна выбрала сваё месца, сваю ролю ў агульнанароднай справе. Але гэта і крытэрый, з якім народ, партыя падыходзяць да ацэнкі работы пісьменніка, мастака, ды і сама літаратура, савецкае мастацтва — да ўласных задач»[1].

У працэсе станаўлення асноў характару чалавека немалое месца займаюць разнастайныя праяўленні чалавечага сумлення як асноўнай рухаючай сілы іх учынкаў, матываванасці паводзін і акрэсленага мэтанакіраванага ладу думак.

Літаратура сацыялістычнага рэалізму заўсёды вылучалася асабліва засяроджанай увагай да патрабаванняў чалавечага сумлення, адлюстроўваючы яго прыкметы з класавых пазіцый, з улікам інтарэсаў сацыялістычнага грамадства.

У беларускай літаратуры неабходнасць пранікаць у глыбіні чалавечай свядомасці, апеліраваць да «святая святых» — чалавечага сумлення, імкненне «будзіць» гэты сапраўдны голас у самім чалавеку праявіліся даўно. З самых першых крокаў нацыянальная проза праяўляла сябе актыўным «парушальнікам спакою» устойлівай грамадскай псіхалогіі, расла і развівалася, абуджаючы ў кожным найперш пачуццё ўласнай чалавечай годнасці, права «людзьмі звацца».

Жыццё па сумленню ў адпаведнасці з агульначалавечымі духоўна-маральнымі нормамі і прынцыпамі, засвоенымі дзякуючы трывалай сувязі з народнай глебай, вызначылі ў цэлым і лёс вясковага настаўніка ў палескай глушы Андрэя Пятровіча Лабановіча з трылогіі Я. Коласа «На ростанях». Тры аповесці — тры этапы станаўлення самасвядомасці героя, сцверджанне сябе як асобы, як носьбіта лепшых маральна-этычных каштоўнасцей, што ў канчатковым выніку і прадвызначыла правільную палітычную арыентацыю ў часе і паказала дарогу ў будучыню — «на прастор, на шырокі прастор!» — на скрыжаваннях розных шляхоў, «на ростанях», на крутых пераломах эпох.

Сумленне ва ўмовах сацыялізма стала ідэалогіяй пралетарскіх мас, духоўным зместам абуджаных да грамадскага жыцця працоўных. Духоў-

ны «брат» Лабановіча — таксама настаўнік па прафесіі Іван Анісімавіч Апейка ў палескіх раманах Івана Мележа [2]. Гэты вобраз у немалой долі ўвасабляе розум, сумленне і гонар эпохі. Герой варты таго, каб імкнуцца быць ва ўсім падобным да яго. Удумлівы, разважлівы, апантаны, перакананы, дзейсны. Ён самаадданна працуе ў перыяд калектывізацыі на вёсцы, з'яўляючыся паўнамоцным прадстаўніком Савецкай улады ў раёне, увасабляе лепшыя рысы чалавека новага часу, аднаго з тыповых прадстаўнікоў ленінскай бальшавіцкай кагорты.

Звернемся да прыклада. Амаль увесь пяты раздзел другой кнігі «Палескай хронікі» Івана Мележа — «Подых навальніцы» — прысвечаны пранікненню ў ход думак галоўнага героя, старшыні райвыканкома, на сесіі ЦВК БССР, якая праходзіла 20—26 лістапада 1929 года, у год «вялікага пералому» — рашучага павароту да суцэльнай калектывізацыі.

Наша крытыка чамусьці дасюль «прапускала» гэтыя старонкі. Адразу старшыня выканкома настройваецца на агульны лад, адчуванне ў яго святочнае, у душы шырыцца і расце «пачуццё выдатнай, здольнай перадолець усё на сваім шляху сілы». Не выпадкова тут пададзены вобраз ракі, яе магутнай плыні («У Апейкі было такое адчуванне, нібыта ён усё глыбей увaходзіў у ваду»), а бурлівая атмасфера сесіі нагадвае яму магутную плынь ранішняй Прыпяці, па якой ён (Апейка — У. Н.) пускаецца плысці, перажываючы пры гэтым «шырокую радасць у душы», якая сугучна «чысціні і шырыні рачнога прастору».

Апейка мае свой уласны погляд на рэчы. Перад намі жывы чалавек са сваім болем, глыбокадумны, лёгкаранімы, душэўны. Гэта не той слухач, погляды і меркаванні якога змяняюцца са зменай выступаючых на трыбуне. Але ён і не наіўны вясковец, які на веру ўспрымае кожнае слова, калі яно прагучала з афіцыйнай трыбуны. Апейка праяўляе тут сапраўдную грамадзянскую і партыйную заклапочанасць.

Гуманістычны пафас раманаў пашыраецца. «Работа душы» не спыняецца ні на мінуту. Унутраны голас уласнага сумлення важака народных мас не маўчыць, не дае спакою, ён зліваецца з галасамі прамоўцаў з глыбінак, засяроджваецца на рашэннях карэннага пералому ў свядомасці сялянства ў адносінах да асновы асноў жыцця на зямлі. Усё гэта сведчыла аб неабходнасці больш цаніць чалавечае ў чалавеку. За гэта выступаў Апейка ў паўсядзённай практыцы.

Мележ праявіў высокае псіхалагічнае майстэрства, разгарнуўшы праз унутраны маналог героя ягоную «біяграфію душы» на многіх старонках рамана. Дасягнута адзінства думкі і пачуцця. Гэта ў той момант, калі персанаж вымушаны, па сутнасці, бяздзейнічаць, бо ён толькі слухае, абагульняе, не ўмешваючыся ў ход падзей. Але як шмат гавораць нам тыя «бяздзейсныя» старонкі. Узбагачаецца ідэйна-філасофская аснова твораў. Да Апейкі прыходзіць адчуванне «шырыні прастору», быццам не толькі раён, рэспубліка, а ўвесь свет сыйшліся тут, ад чаго і «ён» сам «быццам бы больш рэальна, бліжэй пачуў той свет, тую новую вёску, для якой жыў увесь час». Шматгалоссе жыцця адчувае персанаж. У новым святле ўбачыў герой і родны раён — Юравічы, «адну маленькую кропельку ў акіяне», суаднесенай з агульнымі клопатамі краіны, з цэлым светам «у нябывалым паходзе».

Унутраны голас уласнага сумлення стаў для персанажа голасам праўды гістарычнай, партыйнай, той крыніцай, з якой чэрпаюць сілу і веру ў будучае. «Няхай трывога, няхай пакуты, але наперадзе лепшае. Харошае жыццё. Пакуты дзеля добрага — неблагія пакуты. Усё ў рэшце рэшт прыйдзе да лепшага. Гэта — галоўнае!..»

З вобразам Апейкі ў раманах звязаны самыя галоўныя думкі, усё «самае сур'ёзнае» (І. Мележ). Гэты вобраз стаў увасабленнем, паводле слоў Ф. Куляшова, «сапраўднага гуманізма, савецкага дэмакратызма і партыйна-бальшавіцкай прынцыповасці» [3]. Мележ прызнаваўся, што Апейка стаў калі не галоўным, дык адным з галоўных герояў рамана, стаў як бы яго сумленнем. Гэта выдатнае дасягненне прозы І. Мележа, адкрыццё ім сапраўднага носьбіта высокіх маральных якасцей, бальшавіка, які змагаецца за пашырэнне чалавечага ў чалавеку. З'яўляючыся «сумленнем раманаў», увабраўшы ў сябе думкі, дух народа, яго светаўспрыняцце і светаразуменне, Апейка стаў увасабленнем народнага сумлення.

Пафасам сумлення — пафасам камуністычнай маралі прасякнуты раманы І. Мележа. У беларускай прозе на сучасным этапе ўсё выразней праяўляецца названая тэндэнцыя — у маральна-этычных адносінах да праблем рэчаіснасці «руліць вышэй плыні» (Л. Талстой) — зварот менавіта

да глыбінь свядомасці чалавека, да чалавечага сумлення, да таго, што не толькі «у кадры», у полі нашага зроку, але што застаецца «за кадрам», «асядае на дне душы» — да ўнутранай ацэнкі пазітыўных зрухаў у грамадстве, да ўнутранага, якое стасуецца з пачуццямі і думкамі яго самаго, з яго жыццёвай пазіцыяй.

Найбольш адчувальна такая тэндэнцыя — «брацъ вышэй плыні» — праявілася ў І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, У. Караткевіча, В. Быкава, у маладзейшых — А. Жука, В. Казько, А. Кудраўца, В. Карамазава, Л. Дайнекі, В. Гігевіча і інш.

Зварот да голасу ўласнага сумлення і адкрыццё новых этычна-канцэптуальных рыс характару персанажа сталі, такім чынам, для беларускай літаратуры адкрыццём новага героя. Такімі героямі з'яўляюцца Апейка, большасць станоўчых герояў ваенных аповесцей В. Быкава (Глечык, Лазняк, Іван Цярэшка, Васілевіч, маёр Валошын, лейтэнант Іваноўскі, Зося Нарэйка, Сотнікаў, Сцепаніда і Пятрок Багацькі і інш), а таксама Максім Карнач, Іван Васільевіч Антанюк, Сцяпан Дзямідчык, Мацвей Роўда, Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі і інш.

Прыслухоўваючыся да голасу ўласнага сумлення, жывуць і дзейнічаюць гэтыя героі. Што б яны не рабілі, з чым бы ні сутыкаліся ў жыцці. Сам просіцца вярнуцца за лінію фронту, каб узарваць варожую базу з боепрыпасамі, лейтэнант Іваноўскі, спакойна ідзе на шыбеніцу, на сваю Галгофу, Сотнікаў. Гэтак жа, як і з пачуццём высокай чалавечай годнасці сустракаюць смерць на сваім лапіку зямлі, адпакутаваўшы, але даказаўшы, што чалавек можа многае, героі аповесці «Знак бяды».

Ужо ў мірны час, не жадаючы злоўжываць даверам таварышаў па партыі, здымае сваю кандыдатуру пры выбарах у гарком Карнач. Адказнасць перад часам, грамадствам для гэтага героя з'яўляецца адказнасцю ў першую чаргу перад самім сабой, перад уласным сумленнем. Па абавязку сумлення, не жадаючы ісці з ім на кампраміс, едзе працаваць у вёску, у глыбінку Іван Васільевіч Антанюк. Не саступае ні ў чым бракан'ерам, кідаецца ім наперарэз і гіне адзін з «апошніх жураваў», з пакалення франтавікоў, партызан Сцяпан Дзямідчык, які жыве ўвесь час з адкрытым пачуццём сумлення. Нездарма над ягонай магілай, як апошні ўскрык глыбока прабуджанага сумлення, гучыць крык апошняга жураўля.

Трывожыцца за лёс роднай зямлі меліяратар Мацвей Роўда, які ўсё робіць у адпаведнасці з тым, што дыктуе яму ўнутраны голас уласнага сумлення. Часта, вельмі часта ён раіцца з людзьмі, з вяскоўцамі, памятае пра іх, жывых і мёртвых, вядзе ўсхваляваны дыялог з роднымі гонямі, з птушкамі, з дрэвамі, з рэкамі, азёрамі, палескімі дубровамі. Ён за ўсё ў адказе перад уласным сумленнем, а значыць, перад будучыняй.

Па сваёй ахвоце ідзе ў лес на сустрэчу з бандытамі, каб прадухіліць найгоршую бяду, Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі. Гэты герой — жывое ўвасабленне чалавечага сумлення — прайшоў нялёгкі шлях: даваеннае будаўніцтва, нялёгкія франтавыя дарогі. Ён і зараз жыве ў ладзе з сумленнем. Зусім невыпадкова для яго, праўдалюбца і крыштальна сумленнага чалавека, заўзятага паляўнічага, сляды ляснога звера «выводзяць» на сляды злачынцаў. Жыццё гэтага героя — гэта насцеж адкрытыя шляхі праўды, вернасці самому сабе, высокім ідэалам дабра і справядлівасці, якія ён сам для сябе і выбраў і па якіх праходзіць з моцна развітым пачуццём чалавечай годнасці.

З магутным і трывалым маральным стрыжнем у характары жывуць і працуюць гэтыя героі. Значэнне паказу ўзлёту чалавечага сумлення ў характары персанажа нельга пераацаніць. Літаратура, як бачым, імкнецца яго паўней і ўсебаковей раскрываць.

Зварот да маральна-этычных асноў чалавечага характару, да актывізацыі чалавечага ў чалавеку і выяўленне яго асноўнага імператыву — уласнага сумлення — мае ў беларускай літаратуры глыбокія і трывалыя традыцыі. Гэта дае падставы чакаць у хуткім часе новых адкрыццяў у характары, чакаць новага героя сучаснасці.

[1] Гарбачоў М. С. Палітычны даклад Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.— Мінск, 1986.— С. 109.

[2] Мележ Іван. Збор твораў: У 10 т. (Раман «Людзі на балоце» — у пятым, «Подых навальніцы» — у шостым, «Завеі, снежань» у сёмым) — Мінск, 1984.—1986.

[3] Куляшоў Фёдар. Апошні раман Івана Мележа // Полымя.—1980.— № 8.— С. 198.